«ВА ЎЛАДЫ ЁСЦЬ АБ'ЕКТЫЎНАЕ БАЧАННЕ ПРАБЛЕМ, ШТО ХВАЛЮЮЦЬ ЛЮДЗЕЙ, І РАЗУМЕННЕ МЕХАНІЗМАЎ ІХ ВЫРАШЭННЯ»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

— З пачаткам сесіі пачнецца новы этап работы дэпутатаў па фарміраванні і ўдасканаленні заканадаўчай базы краіны. Якія кірункі заканатворчасці з'яўляюцца цяпер галоўнымі?

— Такіх кірункаў я выдзеліў бы тры. Супрацьдзеянне дэструктыўнаму ўплыву наступстваў глабальнага эканамічнага спаду, стымуляванне эканамічнага росту; павышэнне якасці заканадаўства ў адпаведнасці з прыярытэтамі развіцця Беларусі, пазбаўленне яго ад прававых прабелаў, састарэлых нормаў, супярэчнасцяў і дубляванне; далейшая аптымізацыя заканатворчага працэсу з улікам праваапрымяняльнай практыкі па траекторыі ўмацавання ўзаемадзеяння ўсіх яго ўдзельнікаў.

— Аднак жа якасць і аптымізацыя — пагадзіцеся, у многім задачы доўгатэрміновыя, калі не сказаць перманентныя?

— Але на кожным этапе сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны і развіцця заканадаўства яны маюць сваю адметную шкалу. І адно з адным узаемазвязана. Хаця законы прымаюцца парламентам, заканатворчасць з'яўляецца справай калектыўнай. Эфектыўна фарміраваць і абнаўляць прававое поле можна толькі шляхам дакладнай ацэнкі рэгулюемых грамадскіх адносінаў і таго, што трэба змяніць у дзейных законах. Узяць, скажам, эканамічную сферу. Адносінам у ёй характэрна мноства ўзаемасувязяў, асаблівая складанасць прававых, арганізацыйных, кіраўніцкіх і іншых працэсаў. Зводзіць тут заканатворчую работу да павелічэння прававога масіву, не зважаючы на гэтыя ўзаемасувязі і працэсы, было б не проста памылкова, а шкодна. Такая надзвычай складаная нарматворчая праца пад сілу толькі калектыўнаму розуму, салідарным намаганням суб'ектаў права заканадаўчай ініцыятывы, усіх удзельнікаў нарматворчасці і вымагае пастаяннай увагі да кожнага звяна ў ланцужку заканатворчай тэхналогіі і ўсёй заканадаўчай дзейнасці.

— Якую мэту ставяць заканадаўцы, абнаўляючы прававую базу эканамічнага характару?

— Антыкрызісны рэжым эканомікі краіны часовы. Мінулы год паказаў, што ўсе цяжкасці можна пераадолець. Урад рэалізуе набор адпаведных мераў, і сітуацыя паступова мяняецца да лепшага. Нямала робіцца па дэбюракратызацыі эканомічных адносінаў. І ўсё ж эканамічных праблем нямала. Над іх вырашэннем давядзецца напружана папрацаваць і сёлета. Асабліва актуальная тэматыка мадэрнізацыі вытворчасці, павышэння якасці выпускаемай прадукцыі, інавацыйнай і інвестыцыйнай дзейнасці, канкурэнтаздольнасці на знешніх рынках. Таму, абнаўляючы заканадаўчую базу, неабходна дамагацца, каб яна спрыяла эканамічнай стабілізацыі і выхаду эканомікі на новы віток развіцця. Такую задачу паставіў перад парламентам Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Рыгоравіч Лукашэнка. Працуючы над новымі законапраектамі, унесенымі ў Палату прадстаўнікоў, мы зыходзім з таго, што прававы механізм павінен быць адэкватны хутка зменлівым эканамічным рэаліям. На вясновай сесіі мяркуем адкарэктаваць законы «Аб гаспадарчых таварыствах», аб навуковай, навукова-тэхнічнай і інавацыйнай дзейнасці, аб аб'ектах дзяржаўнай уласнасці, аб прыватызацыі дзяржаўнай маёмасці, аб архітэктурнай і будаўнічай справе, Кодэкс аб зямлі і іншыя. У нашых намерах таксама ратыфікацыя некалькіх міжнародных пагадненняў эканамічнага характару.

— Парламенцкая работа патрабуе ад дэпутатаў актыўнай пазіцыі не толькі ў заканатворчым працэсе, але і ў грамадска-палітычным жыцці дзяржавы. Амаль трэць сесіі пройдзе ў апагей выбарчай кампаніі ў мясцовыя Саветы дэпутатаў. Напэўна, і дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не застаюцца ўбаку ад гэтай важнай палітычнай падзеі?

— Я хацеў бы сказаць, што ўзаемадзеянне дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў са сваімі калегамі з мясцовых Саветаў не зводзіцца да разавых акцый з нагоды тых ці іншых грамадска-палітычных падзей, у тым ліку і выбараў. Парламентарый павінен пастаянна трымаць руку на пульсе жыцця сваёй выбарчай акругі, ведаць мясцовыя сацыяльна-эканамічныя праблемы і садзейнічаць іх вырашэнню. Таму ў раскладзе нашай дэпутацкай работы ў выбарчых акругах рэгулярны ўдзел у сесіях мясцовых Саветаў, пасяджэннях райвыканкамаў і ў асабліва значных мерапрыемствах, наведванне прадпрыемстваў, гаспадарак і ўстаноў, прыём грамадзян. Зразумела, цікавяцца дэпутаты і выбарчым марафонам у мясцовыя Саветы, а падчас выбараў будуць мець магчымасць назіраць за ходам галасавання на выбарчых участках.

— Як вы лічыце, удзел партый і грамадскіх рухаў у мясцовых выбарах павысіць іх папулярнасць?

— Абноўленае выбарчае заканадаўства дало ўсім партыям і грамадскім рухам магчымасць актыўна весці агітацыйную работу за сваіх кандыдатаў у дэпутаты. Наколькі яны яе выкарыстаюць, настолькі і павялічаць колькасць прыхільнікаў сваіх ідэй і праграм.

— Ці магчыма, на ваш погляд, у нашай краіне рэальна дзейная шматпартыйнасць?

— Заканадаўчых перашкод для гэтага няма. Неабходна толькі рэальна стваральная дзейнасць партый, якую бачылі б не толькі ў сталіцы і абласных гарадах, а найбольш — у райцэнтрах, мястэчках і маленькіх вёсачках. Каб партыі рупліва займаліся тым, што клапоціць штодзень простага чалавека і цягавіта шчыравалі, як некалі тыя ж — помніце? — цімураўцы. Вось тады і аўтарытэт іх пачаў бы расці як на дражджах. На заквасцы ж пустапарожніх размоў, абяцанняў малочных рэк і залатых гор і набіўшага аскоміну крытыканства, чым асабліва захапіліся партыі заўзятага апазіцыйнага кшталту, далёка не заедзеш. Партыйнае жыццё, якое адарвана ад рэальнага жыцця простых людзей, зацыклена на міжусобіцах і сутычках асабістых амбіцый, застаецца замкнёным на самім сабе і развівацца не можа. Колькі ні садзіся на канька «недасканаласці заканадаўства».

— Вернемся да сесійных клопатаў. На пасяджэнні ў Авальную залу дэпутаты збяруцца са свежымі ўражаннямі пасля паездак у рэгіёны. Ці ўплываюць гэтыя, так бы мовіць, сацыяльныя замеры на заканадаўчую работу?

— Актуальныя для грамадзян жыццёвыя праблемы не застаюцца па-за ўвагай парламентарыяў. Нагадаю, што ў сесійны перыяд, звычайна ў канцы кожнага месяца, мы праводзім сумеснае пасяджэнне Палаты прадстаўнікоў і Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу, на якім, як правіла, адзін з віцэ-прэм'ераў робіць даклад аб выніках сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны, становішчы спраў у тым ці іншым сектары эканомікі альбо сацыяльнай сферы, а потым разам з іншымі членамі ўрада адказвае на пытанні. На папярэдняй, трэцяй, сесіі, напрыклад, парламентарыям дакладвалі намеснікі прэм'ер-міністра У.М. Патупчык, В.П. Бура, А.У Кабякоў. Прычым дэпутаты задаюць пытанні не агульнага плана, а зусім канкрэтныя, «прывезеныя» са сваіх выбарчых акруг, самай шырокай тэматыкі.

— І вострага сацыяльнага характару?

— Гэта ў першую чаргу. У тым ліку па цэнаўтварэнні, тэрмінах павышэння зарплаты для той ці іншай катэгорыі работнікаў бюджэтнай сферы, аплаце камунальных паслуг, будаўніцтве і аснашчэнні аб'ектаў аховы здароўя, рэалізацыі лекавых сродкаў, атрыманні крэдытаў на набыццё жылля, павышэнні эфектыўнасці работы грамадскага транспарту, аказанні дапамогі інвалідам і г.д. Прычым, уздымаючы праблемы, дэпутаты нярэдка выказваюць і свае прапановы па змяненні заканадаўства. Карыснасць такіх сумесных пасяджэнняў палат Нацыянальнага сходу несумненная.

— У чым гэта праяўляецца?

— У тым, што па многіх пытаннях, на якіх засяроджваюць увагу парламентарыі, урадам, міністэрствамі, ведамствамі і іншымі дзяржаўнымі органамі прымаюцца аператыўныя рашэнні, а найбольш канструктыўныя прапановы акумулююцца пры ўдасканаленні нарматыўнай прававой базы. На вясновай сесіі мы працягнем работу ў гэтым кірунку. Будзем паглыбляць змястоўную насычанасць нашых выязных семінараў па вывучэнні практыкі прымянення заканадаўства і ўзаемадзеяння з мясцовымі органамі ўлады, а таксама выязных пасяджэнняў пастаянных камісій. Гэта добрая магчымасць ацаніць эфектыўнасць дзейных законаў тымі, хто па іх працуе, вызначыць, дзе наспела карэкціроўка, якія прававыя навацыі важна закласці ў новыя законапраекты, каб яны адэкватна адлюстроўвалі патрабаванні рэгулюемай сферы.

Вельмі важным інструментам сацыяльнага замеру настрояў людзей, які дапамагае нам у фарміраванні і абнаўленні прававога поля, мы лічым пісьмовыя і вусныя звароты грамадзян. Яны ўважліва вывучаюцца нашымі профільнымі камісіямі і структурнымі падраздзяленнямі Сакратарыята Палаты прадстаўнікоў. Зразумела, не ва ўсіх зваротах ставяцца пытанні шырокага грамадскага гучання, але ўсе талковыя, абгрунтаваныя прапановы мы занатоўваем. Калі ёсць такая неабходнасць, накіроўваем іх у рэспубліканскія дзяржаўныя органы, з якімі працуем у цесным узаемадзеянні. Людзі могуць быць упэўненыя: у заканадаўцаў, як і ва ўсёй дзяржаўнай улады, ёсць аб'ектыўнае бачанне праблем, што хвалююць людзей, і разуменне механізмаў іх вырашэння.

— Законапраекты якой яшчэ тэматыкі, акрамя ўжо названай вамі эканамічнай, мяркуецца абмеркаваць на вясновай сесіі?

— У другім чытанні, якое завяршыць нашу заканатворчую работу, плануем разгледзець змяненні і дапаўненні ў законы «Аб воінскім абавязку і воінскай службе», «Аб ахове навакольнага асяроддзя», «Аб турызме», у Крымінальна-працэсуальны кодэкс, у заканадаўства па пытаннях абароны правоў і законных інтарэсаў дзяцей, прадухілення легалізацыі даходаў, атрыманых злачынным шляхам, і фінансавання тэрарыстычнай дзейнасці. Да ратыфікацыі падрыхтаваны блок міжнародных пагадненняў і дагавораў, сярод якіх з Украінай — аб бязвізавых паездках грамадзян, аб дзяржаўнай граніцы, аб перадачы асуджаных для далейшага адбывання пакарання, з Казахстанам — аб супрацоўніцтве па папярэджанні і ліквідацыі надзвычайных сітуацый, аб супрацоўніцтве ў галіне вышэйшай і паслядыпломнай адукацыі, з Туркменістанам — аб супрацоўніцтве і ўзаемнай дапамозе ў мытных справах, аб міжнародных аўтамабільных пасажырскіх і грузавых перавозках. У першым чытанні будуць абмяркоўвацца законапраекты «Аб знешняй працоўнай міграцыі», «Аб донарстве крыві і яе кампанентаў» і іншыя.

Сур'ёзны задзел для плённай заканатворчай работы створаны. З першага дня сесіі мы будзем працаваць без раскачкі, на поўную сілу, чаго і чакаюць ад нас выбаршчыкі.

Аляксандр ФІЛІМОНАЎ.

Ад Камітэта па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь

У адпаведнасці з пунктам 9 Палажэння аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь, зацверджанага Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 5 мая 2006 г. № 300 «Аб Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь», з мэтай шырокага азнаямлення грамадскасці прадстаўляецца інфармацыя аб работах, дапушчаных да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь 2010 года.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі 2010 года дапушчаны наступныя работы:

Маруковіч Яўгеній Ігнацьевіч, Беўза Уладзімір Фёдаравіч, Бадзяка Аляксандр Міхайлавіч. Работа «Стварэнне і прамысловая рэалізацыя прынцыпова новага метаду беспераплынна-цыклічнага ліцця намарожваннем высоказносастойкіх дэталяў тэхнікі». Вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі дзяржаўнай навуковай установай «Інстытут тэхналогіі металаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі». Прадстаўлена Нацыянальнай акадэміяй навук Беларусі.

Марыеў Павел Лук'янавіч, Егораў Аляксандр Мікалаевіч, Бігель Мікалай Віктаравіч. Работа «Распрацоўка і засваенне вытворчасці сямейства кар'ерных самазвалаў асабліва вялікай грузападымальнасці з электрамеханічнай трансмісіяй чацвёртага пакалення». Вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі рэспубліканскім унітарным вытворчым прадпрыемствам «Беларускі аўтамабільны завод» вытворчага аб'яднання «БелАЗ». Прадстаўлена Міністэрствам прамысловасці.

Сакалоўскі Анатоль Міхайлавіч, Бялецкі Аляксандр Валянцінавіч, Сакалоўскі Алег Анатольевіч. Работа «Распрацоўка і ўкараненне сучасных хірургічных тэхналогій лячэння артапедычнай паталогіі тазасцегнавога сустава ў дзяцей і падлеткаў». Вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі дзяржаўнай установай «Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр «Траўматалогія і артапедыя». Прадстаўлена Міністэрствам аховы здароўя.

Сінягоўскі Генадзій Аляксандравіч, Галавач Андрэй Альбертавіч, Нікалаеў Юрый Іванавіч. Работа «Распрацоўка і засваенне вытворчасці спецыяльных колавых шасі чацвёртага пакалення ваенна-тэхнічнага і двайнога прызначэння». Вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі вытворчым рэспубліканскім унітарным прадпрыемствам «Мінскі завод колавых цягачоў». Прадстаўлена Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі звяртаецца да спецыялістаў, кіраўнікоў арганізацый, навучальных устаноў, прадпрыемстваў, органаў дзяржаўнага кіравання, грамадскіх аб'яднанняў з просьбай прыняць удзел у абмеркаванні работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі спецыялістаў, матэрыялы грамадскага абмеркавання, прапановы і заўвагі просьба накіроўваць да 15 верасня 2010 г. на адрас: 220072, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 66, каб. 446. Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне навукі і тэхнікі. Тэл. 284 11 63. Тэл./факс (017) 284 24 56.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры паведамляе, што да ўдзелу ў конкурсе на атрыманне Дзяржаўных прэмій Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры 2010 года дапушчаны наступныя работы:

Анісенка Валерый Данілавіч, Мархель Таццяна Рыгораўна, Сідаркевіч Людміла Аляксандраўна. Спектакль «Жанчыны Бергмана», М. Рудкоўскі. Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры дзяржаўнай установай «Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Левін Леанід Мендзелевіч, Фінскі Аляксандр Міхайлавіч, Каткова Святлана Сяргееўна. Мемарыял «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны» ў г.п. Чырвоны Бераг Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры ўстановай адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Гніламёдаў Уладзімір Васільевіч. Раманы «Уліс з Прускі» (2004), «Расія» (2005). Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры грамадскім аб'яднаннем «Саюз пісьменнікаў Беларусі». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Татарнікаў Павел Юр'евіч. Серыя графічных твораў «Брама мінулага». Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз мастакоў» і ўстановай адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Гаявая Валянціна Іванаўна. Музычна-харэаграфічная праграма «Беларусы». Вылучана на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры дзяржаўнай установай «Беларускі дзяржаўны заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі». Прадстаўлена Міністэрствам культуры.

Гаухвельд Міхаіл Лейбавіч, Данілаў Вячаслаў Мікалаевіч, Нікіцін Віктар Дзмітрыевіч. Стварэнне праекта падземнага грамадска-гандлёвага цэнтра «Сталіца» на пл. Незалежнасці ў г. Мінску. Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры грамадскім аб'яднаннем «Беларускі саюз архітэктараў». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Аляксееў Аляксандр Аляксеевіч, Лукашэвіч Алег Вацлававіч. Мастацкі праект «Спадчына Беларусі». Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры калектывам Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь. Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Янкоўскі Расціслаў Іванавіч. За ўвасабленне на сцэне гістарычна значных вобразаў у творах айчыннай і замежнай класікі. Вылучаны на атрыманне Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры калектывам дзяржаўнай установы «Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя М. Горкага». Прадстаўлены Міністэрствам культуры.

Падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры звяртаецца да кіраўнікоў арганізацый, навучальных устаноў, прадпрыемстваў, міністэрстваў і ведамстваў з просьбай правесці грамадскае абмеркаванне пералічаных работ і аўтарскіх калектываў.

Водгукі, матэрыялы абмеркаванняў, прапановы і заўвагі па работах і аўтарах просьба накіроўваць у падкамітэт па Дзяржаўных прэміях Рэспублікі Беларусь у галіне літаратуры, мастацтва і архітэктуры да 15 верасня 2010 г. на адрас: 220072, г. Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2, каб. 412. Тэл./факс (017) 284 23 81.

У суседзяў

Ва ўрадзе Украіны задумаліся пра саюз з Расіяй і Беларуссю

Віцэ-прэм'ер Уладзімір Семінажэнка лічыць, што Украіне варта разгледзець ідэю стварэння саюзнай дзяржавы з Расіяй і Беларуссю. Пра гэта ён заявіў у эфіры Шустэр Live, піша NEWSru.ua.

Семінажэнка адзначыў, што стварэнне такога саюза з'яўляецца «адной са схем, якая, як і любая, мае права на разгляд, гэтак жа як і ўдзел Украіны ў Еўрасаюзе». Віцэ-прэм'ер падкрэсліў, што гаворка ідзе пра саюз, дзе «вызначаюцца правілы па тыпе ЕС».

Спасылаючыся на звесткі Інстытута сацыялогіі Нацыянальнай акадэміі навук, Семінажэнка заявіў, што большасць украінцаў хочуць увайсці ў саюз з Расіяй і Беларуссю. «Людзі хочуць саюзнай дзяржавы і вераць, што гэта прывядзе да поспеху краіны», — сказаў ён. Віцэ-прэм'ер таксама адзначыў, што «Украіну ў ЕС, прынамсі, найбліжэйшыя 15 гадоў ніхто не чакае».

Нагадаем, раней расійскі прэм'ер Уладзімір Пуцін растлумачыў розніцу ў коштах на расійскі газ для Мінска і для Кіева тым, што Беларусь уваходзіць у інтэграцыйныя аб'яднанні з РФ, у адрозненне ад Украіны.

Крэмль змагаецца з карупцыяй на фоне бурлення ў расійскім грамадстве

Карупцыя ў Расіі — «з'ява штодзённая і характэрная», паведамляе чытачам The Times журналіст Тоні Хэлпін. «Кіроўцы штодня падвяргаюцца прагону скрозь строй гаішнікаў, якія вымагаюць хабар, бацькі і пацыенты падмазваюць настаўнікаў і медыкаў, дамагаючыся іх добразычлівага стаўлення, а бізнэсмены спрабуюць адкрываць новыя прадпрыемствы перад тварам бюракратаў, якія патрабуюць адкаты за выдачу ліцэнзіі ці проста каб пазбегнуць праблем».

Мядзведзеў абвясціў сваёй прыярытэтнай задачай мадэрнізацыю расійскай эканомікі і запатрабаваў скончыць з «культурай хабарніцтва, якая стварае пагрозу будучыні Расіі». Да гэтага яго падштурхоўвае і «палітычны імператыў», пад якім The Times мае на ўвазе апазіцыйную актыўнасць і, у прыватнасці, «Дзень гневу», які прайшоў нядаўна. Хай гэтыя дэманстрацыі і «не сабралі велізарных натоўпаў, якіх чакалі апазіцыйныя лідары... Але акцыі пратэсту прайшлі адразу ў 50 гарадах і паказалі незадаволенасць грамадства карумпаванасцю чыноўнікаў, што нажываюцца на простых грамадзянах, якія спрабуюць перажыць эканамічны крызіс», піша газета.

У Крамлі мітынгі апазіцыі палічылі за лепшае «замяць», але там добра разумеюць, што карупцыя можа выклікаць куды мацнейшы «пажар», пры сутыкненні з якім уладам будзе цяжка пазбегнуць грамадскіх хваляванняў.

Спікер польскага Сойма стаў кандыдатам у прэзідэнты

Кандыдатам у прэзідэнты Польшчы ад кіруючай партыі «Грамадзянская платформа» стаў спікер Сойма Браніслаў Камароўскі.

Афіцыйнае рашэнне было абвешчана ў суботу — у партыі прайшлі папярэднія выбары. Падчас праймерыз перамог Камароўскі (68,5 %), другі прэтэндэнт, цяперашні міністр замежных спраў Польшчы Радаслаў Сікорскі, атрымаў 31,5 % галасоў членаў партыі. Выбары прэзідэнта Польшчы пройдуць увосень 2010 года.

ДРОВЫ — ЗА ЕЎРА

З КАМАНДЗІРОЎКІ ў расійскую Валагодчыну дырэктар ельскага лясгаса Сяргей Матузка вярнуўся ў свой калектыў з новай ідэяй: ёсць магчымасць падзарабіць дадатковыя грошы, папоўніць фінансавую кішэню прадпрыемства. Прычым валютай. У гэтым ён упэўніўся, калі пазнаёміўся з дзейнасцю некалькіх лесагаспадарчых арганізацый расіян, меў гутаркі з іхнімі кіраўнікамі і спецыялістамі, якія падзяліліся сваім вопытам супрацоўніцтва з фірмамі асобных заходнееўрапейскіх краін на зусім новай аснове: пастаўцы туды колатых дроў.

Чаго-чаго, а гэтага дабра ў Ельскім лясгасе нарабіць можна многа. Тут табе і пацурбалкі, што застаюцца ад камлёў ці верхавін дрэў, непрыдатныя для вытворчасці піламатэрыялаў, і драўніна, што нарыхтоўваецца падчас прарэджвання лесасек, ці тое, што ўсохла на корані або было паваленае падчас ураганаў, і шмат чаго іншага. Калі расіяне здолелі наладзіць працу, думаў Сяргей Міхайлавіч, дык і мы зможам. Трэба толькі знайсці зацікаўленых замежных партнёраў, заключыць з імі дамовы і арганізаваць у сваім калектыве вытворчы працэс такім чынам, каб прадукцыя адпавядала ўсім экспартным патрабаванням.

Не будзем тут пералічваць усе захады да ажыццяўлення ідэі, але зазначым: пачатак атрымаўся. На першым этапе колкай дроў займаліся тры чалавекі. Уручную, з сякерамі-калунамі ды жалезнымі клінамі. Але потым лясгас набыў дрывакольны станок, на якім з красавіка мінулага года працуюць двое рабочых. Кожны месяц тут нарыхтоўвалася пяць грузавікоў колатых дроў па 32 кубаметры ў кожным, і яны бралі кірунак на Галандыю. Выручка ад рэйса — тысяча еўра. За мінулы год яна склала каля сарака тысяч еўра.

— А ці ёсць магчымасць павялічыць гэту суму?

— Ёсць, — адказвае Сяргей Міхайлавіч. — Але трэба дадаткова папрацаваць, што-нішто змяніць. Напрыклад, арганізаваць яшчэ адну змену. Добра было б займець і сушыльную камеру для дроў у дадатак да камеры для сушкі піламатэрыялаў. Будзем думаць. Мы ж толькі на пачатку новай справы.

Каментарый да нашай размовы дае **галоўны інжынер Гомельскага дзяржаўнага вытворчага лесагаспадарчага аб'яднання Аляксандр ВАСІЛЕНКА:**

— З еўра, вобразна кажучы, сябруюць (або яшчэ маюць намер зрабіць гэта) пацурбалкі з лясоў Рагачоўскага, Буда-Кашалёўскага, Петрыкаўскага і іншых раёнаў нашай вобласці. Бо колатыя дровы запатрабаваныя ў Бельгіі, Германіі, Нідэрландах і выкарыстоўваюцца ў якасці паліўнага матэрыялу ў камінах многіх жыхароў гэтых і іншых краін.

Тэхнічныя патрабаванні да такіх дроў наступныя. Як правіла, яны павінны быць лісцёвых парод — вольхі, дуба, бярозы, ясеня. Пра трухлявыя ці з гніллю, вядома ж, размовы не пачынай. А з сучкамі — можна. Вільготнасць дроў дапускаецца ўдвая меншая за натуральную (ад сонца, ветру і г. д.), а ўпакоўваюцца ў спецыяльную тару. Сёлета запланавана ў даволі сур'ёзных аб'ёмах прамысловая нарыхтоўка дроў на экспарт у Мілашэвіцкім (Лельчыцкі раён) і Буда-Кашалёўскім лясгасах. За дзень — па 25 кубаметраў у кожным.

— А як з сыравіннай базай для нарыхтоўкі дроў у лясгасах вобласці наогул?

— Яна даволі прыстойная. Дастаткова сказаць, што рэшткі ўсіх дроў на канец мінулага года ў лясгасах складалі 260 тысяч кубаметраў. Іх трэба яшчэ выкарыстоўваць. У прыватнасці, у Буда-Кашалёўскім лясгасе шмат дубняку, з якога (а ён засыхае на корані) атрымліваецца найбольш якасны паліўны прадукт. Тут ужо вызначана паўгектарная пляцоўка, дзе будзе ўсталяваная фінская ці шведская дрывакольная механізаваная лінія (машына) прыблізным коштам 120 мільёнаў рублёў. Побач з'явіцца і сушыльная камера. Аналагічны вытворчы працэс будзе наладжаны і ў Мілашэвіцкім лясгасе. Няма сумненняў, што праекты гэтыя акупяцца. Ёсць спадзяванне, што экспарт колатых дроў у далейшым набудзе большы размах.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ.

Ну і ну!

НЯСПРАЎНЫ ХАЛАДЗІЛЬНІК ВЫВЕЎ НА ВУЛІЦУ 200 ЧАЛАВЕК

У 4 гадзіны ночы з-за пажару, які ўспыхнуў ў памяшканні Гомельскага дзяржаўнага машынабудаўнічага каледжа, былі эвакуяваныя 200 навучэнцаў вучэбнай установы.

Як паведамілі ў прэс-службе Гомельскага абласнога ўпраўлення МНС, эвакуацыя жыхароў інтэрната адбывалася ва ўмовах моцнай задымленасці. Паводле папярэдняй інфармацыі, у адным з пакояў на першым паверсе знаходзіўся халадзільнік, праводка якога дала кароткае замыканне, што і стала прычынай пажару. Пацярпелых у гэтым здарэнні няма.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Сам сабе псіхолаг

КАБ ПЕРААДОЛЕЦЬ СТРЭС — ДЗЕЙНІЧАЙЦЕ!

Як лёгка часам людзі вымаўляюць у адказ на пытанне, чаму ў іх стомлены выгляд або незадаволены твар: «Ды ў мяне стрэс!». А далей пачынаецца, як правіла, пералічэнне ўсіх цяжкасцяў — ад праблем са здароўем да праблем у зносінах з людзьмі. І здаецца, што стрэсавы стан — гэта штосьці звычайнае, непазбежнае, як дрэннае надвор'е. Давайце разбяромся, ці так гэта.

Стрэс — ахоўная рэакцыя арганізма на тое, што палохае чалавека, раздражняе або пагражае яму, на інтэнсіўнае, незвычайнае знешняе ўздзеянне. Стрэс (безумоўна, не надта моцны) неабходны чалавеку, паколькі стымулюе дзейнасць нервовай сістэмы і работу ўнутраных органаў. Чалавек, як любая жывая істота, так устроены, што ў выпадку небяспекі, неабходнасці пераадолець раптам узніклую перашкоду выпрацоўвае гармоны, якія выкідваюцца ў кроў. Гэта адразу надае нам моцы, раскрывае новыя здольнасці — дае магчымасць пераадолення гэтых перашкод, павышае шанцы на выжыванне. Гэта нармальная рэакцыя арганізма на стрэс. Але жыццё сучаснага чалавека немагчымае без аўралаў на працы, хваробаў і стратаў блізкіх людзей, разводаў і да т.п. І калі такія непрыемныя падзеі доўжацца працяглы час, назапашваюцца, з'яўляецца рызыка развіцця хранічнага стрэсу, які шкодны і нават небяспечны, бо гармоны, накіраваныя на пераадоленне перашкод, не растрачваюцца, а назапашваюцца ў лішку і могуць нанесці шкоду здароўю. Хранічны стрэс — вынік пастаяннага або працяглага знаходжання ў становішчы, якое гняце чалавека. (Дарэчы, праявы стрэсу знойдуць у сябе многія: парушэнне канцэнтрацыі ўвагі, зніжэнне працаздольнасці, хуткая стомленасць, раздражняльнасць, агрэсіўнасць, беспадстаўныя трывожнасць і страхі, пастаяннае гнятучае адчуванне віны і г.д.).

Як жа навучыцца пазбягаць стрэсавых сітуацый на працы і дома? Для гэтага неабходна:

правільна размяркоўваць час

■ пры дэфіцыце часу першае правіла — не запускаць справы;

■ хатнюю працу рабіць не ад выпадку да выпадку, а намячаць загадзя і выконваць яе рэгулярна;

■ пры наяўнасці мноства спраў неабходна пачынаць з найбольш важных, а заканчваць менш важнымі.

дакладна арганізаваць працу

■ падрыхтаваць працоўнае месца, прыбраць усё лішняе і запасціся неабходным;

■ перад пачаткам працы варта паклапаціцца, каб вашу ўвагу не адцягвалі; уладзіць усе лішнія справы (напрыклад, загадзя зрабіць неабходныя тэлефонныя званкі).

умець адпачываць

Нават пры вялікай загружанасці людзям, якія ўмеюць арганізаваць свой вольны час, не страшны ніякі стрэс. Лепшы від адпачынку — гэта змена дзейнасці. Калі на працягу працоўнага дня вы нічога цяжэйшага, чым ручка, не падымаеце, у выхадны варта заняцца фізічнай працай або спортам. І наадварот, пасля інтэнсіўнага працоўнага тыдня з цяжкімі фізічнымі нагрузкамі ў выхадныя лепш расслабіцца. Карысная спакойная прагулка ў лесе, паход у кіно або тэатр. Такія мерапрыемствы лепш планаваць загадзя.

І ўсё ж самае галоўнае, ад чаго залежыць, ці будзе ў чалавека хранічны стрэс, — яго эмоцыі, яго стаўленне да непрыемнасцяў і падзей, што адбываюцца вакол. Ужо даказана, што настрой чалавека аказвае наймацнейшы ўплыў на яго здароўе. Усё, што адбываецца ў нас у галаве, што мы сабе ўяўляем, пра што думаем, уплывае на наш стан, прычым адбываецца гэта нібыта само па сабе, аўтаматычна, па-за нашай свядомасцю. Калі мы ўспамінаем добрыя падзеі — зведваем радасць, пры дрэнных успамінах — адчуваем цяжар на душы.

Узнікае пытанне: «А ці можа чалавек кіраваць сваімі эмоцыямі?». Так, можа. І калі ён сапраўды клапоціцца пра сябе, то павінен гэтаму навучыцца. Вучыцеся падаўляць у сабе злосныя пачуцці — зайздрасць, незадавальненне сабой, навакольнымі, працай; не раздражняцца па прычыне дробных жыццёвых праблем. Не прад'яўляйце празмерных патрабаванняў да навакольных, асабліва ў сям'і, не імкніцеся пад сябе перарабіць жонку (мужа), дарослых дзяцей. Прымайце людзей такімі, якія яны ёсць. Дарослага чалавека перавыхаваць складана, а перавыхаванне выклікае раздражненне з яго боку. Не ўпадайце ў гнеў, калі штосьці або хтосьці раздражняе; не рэагуйце адразу — наколькі гэта магчыма, палічыце ў думках, зрабіце дватры глыбокія ўдыхі. Падумайце і пастарайцеся зразумець пункт гледжання гэтага «раздражняльніка», калі гэта канкрэтны чалавек. Пашукайце спакойны і далікатны спосаб паўплываць на яго, выкарыстайце жарт.

Пераадолець дрэнны эмацыйны стан і зняць раздражненне дапамогуць наступныя практыкаванні ўсходняй медыцыны:

■ скрыжуйце ўказальныя пальцы рук, перавядзіце рукі за галаву, ногі пастаўце на шырыню плячэй, наскі ў бакі; робячы ўдых, злучыце ногі і застыньце ў гэтым становішчы на 5 секундаў; цяпер паступова вярніцеся ў зыходнае становішча, робячы выдых (паўтарыце 10 разоў);

■ лежачы на падлозе, абдыміце калені і як мага шчыльней прыцісніцеся да іх (выконваць 2 хвіліны).

Псіхолагі рэкамендуюць для гэтых мэтаў і аўтатрэнінгі. Яны даступныя і простыя. Каб выклікаць у сябе стан унутранага спакою і камфорту, выканайце практыкаванне «сховішча». Вы ў думках ствараеце сабе сховішча — месца, дзе вас ніхто не патрывожыць і не патурбуе, і ў думках знаходзьцеся ў ім нейкі час. Гэта можа быць што заўгодна — любімы пакой, бераг мора, шалаш у лесе, нават іншая планета... Адзіная ўмова — каб вы адчувалі сябе спакойна, утульна. Супакоіўшыся і адпачыўшы, вяртайцеся ў рэальны свет. Для гэтага дастаткова глыбока ўздыхнуць і расплюшчыць вочы.

І яшчэ некалькі канкрэтных парад па выхадзе са стрэсавых станаў:

■ забяспечце сабе дастатковы сон — гэта лекавы сродак пры нервовым напружанні;

■ зрабіце масаж або самамасаж, які паляпшае кровазварот, павышае мышачны тонус і выклікае адчуванне расслабленасці;

■ наведайце лазню, якая асвяжыць не толькі цела, але і душу;

■ выкарыстайце музыкатэрапію: любімая мелодыя выклікае станоўчыя эмоцыі, дапамагае забыцца на стомленасць і прычыны стрэсу, нармалізуе артэрыяльны ціск і пульс;

■ вазьміце водпуск, калі стрэс выкліканы непрыемнасцямі на працы.

І самае галоўнае ў прафілактыцы стрэсу: неабходна заўсёды памятаць, што з любой жыццёвай сітуацыі, лёсавызначальнай або паўсядзённай, ёсць выйсце, а ў чалавека ёсць права змяніць сябе або сваё стаўленне да таго, што ён лічыць няшчасцем, бядой. Кіраваць сваімі эмоцыямі не толькі можна, але і трэба. Асноўнае ў пераадоленні жыццёвых перашкод — дзеянне (рухі, учынкі), а гэта заўсёды лепш, чым пакорнасць абставінам.

Падрыхтавала Вольга ЦЫБУЛЬСКАЯ.

Калі вы падпісаліся на газету **«Звязда» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года** — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце яе **да 9 красавіка** ў рэдакцыю на адрас: **220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А**.

Падпісчык можа выйграць электрачайнікі, DVD-прайгравальнікі, тэлевізары, печ ЗВЧ і кухонны камбайн. Розыгрыш прызоў адбудзецца **13 красавіка 2010 г.**, вынікі публікуюцца ў газеце «Звязда» **па 21 красавіка 2010 г.**

Дастаўку прызоў ажыццяўляе рэдакцыя. Атрымаць прыз можна самастойна ў рэдакцыі **па 30 чэрвеня 2010 г.** пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года і пашпарта. **Пасля 30 чэрвеня** выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца.

Правілы гульні чытайце ў газеце «Звязда» за 02.03.10.

Тэрмін правядзення гульні — з 2.03.10 па 30.06.10.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 1639 ад 26.02.10, выдадзена Міністэрствам гандлю РБ.

11 Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на II квартал або 1-е паўгоддзе 2010 года

Прозвішча, імя, імя па бацьку ____________________

____

Падпіска афармлена і аплачана ў ____________________
(аддзяленне сувязі)

____________ **на II кв. або 1–е паўг. 2010 года**

Хатні адрас і тэлефон ________ ____________
(індэкс)

____

____

Удачы ў розыгрышы!

Ф.СП-1 Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь

АБАНЕМЕНТ на газету ________ (індэкс выдання)

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Колькасць камплектаў

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму ____________________
Куды ____________________ (прозвішча, ініцыялы)
____________________ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)

ДАСТАВАЧНАЯ КАРТКА на газету ________ (індэкс выдання)

ПВ | месца | літар

ЗВЯЗДА з бясплатнымі ўкладкамі: «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА», «МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ», «КРАІНА ЗДАРОЎЯ», «ЖЫРАНДОЛЯ», «КУПЛЯЙ ЛЕПШАЕ!» «НАСУПЕРАК ЧАРНОБЫЛЮ»

Кошт	падпіскі	______ руб.	Колькасць камплектаў
	пераадрасоўкі	______ руб.	

на 2010 год па месяцах

1	2	3	4	5	6	7	8	9	10	11	12

Каму ____________________
Куды ____________________ (прозвішча, ініцыялы)
____________________ (адрас)
(паштовы індэкс) (горад, населены пункт)